***Кацярына Чарнова***

## ДАСЛЕДАВАННЕ «НАРОДНЫХ» ВЕРСІЙ ПРАВАСЛАЎНЫХ ПЕСНАПЕННЯЎ У НАПРАМКУ ЭТНАМУЗЫКАЗНАЎСТВЕ

Пытанні рэлігійных уяўленняў носьбітаў фальклорнай традыцыі, якія выступаюць вынікам адаптацыі хрысціянскіх каштоўнасцей у традыцыйным асяроддзі, маюць на сённяшні час шырокая прадстаўніцтва ў літаратуразнаўчых і культуралагічных даследаваннях. Разам з тым, праявы культуры, якія належаць сферы так званага «народнага хрысціянства» («народнага багаслоўя», «фальклорнага праваслаўя», «царкоўна-народнага праваслаўя») застаюцца па-ранейшаму актуальнымі для навуковых роздумаў.

Праявы «фальклорнага праваслаўя» у сферы традыцыйнай музычнай культуры апошнім часам усё часцей становяцца аб'ектам этнамузыказнаўчай зацікаўленасці. Агляд сучаснага расійскага і беларускага навуковага друку паказвае, што раскрыццё адаптацыі/перапрацоўкі тэкстаў хрысціянскай культуры ў іх так званых «народных»/«фальклорных» варыянтах з'яўляецца адным з актуальных напрамкаў у даследаванні этнапесенных традыцый.

Вывучэнне вуснатрадыцыйных увасабленняў праваслаўных богаслужбовых песнапенняў да апошняга часу складала асобы накірунак, па сутнасці, толькі ў расійскай этнамузыкалогіі, дзе былі здзейснены спробы комплекснай распрацоўкі пытанняў функцыянавання царкоўных гімнаў у сялянскім побыце. Расійскія музыколагі прапанавалі разгляды «народных версій» кананічных песнапенняў у аспекце іх быцця ў сістэме песенных рытуалаў каляндарна-земляробчага цыкла[1] [2–5, 8, 12], якія дазволілі шматгранна асвятліць спецыфіку адаптацыі царкоўных песнапенняў у этнапесенных практыках. Сваё раскрыццё набылі, па-першае, каналы, па якіх богаслужбовыя песнапенні ўключаюцца ў сістэму каляндарнай песеннасці (улучэнне іх ў абходныя формы), па-другое, звязаныя з гэтым працэсам механізмы засваення
і трансфармацыі ўсталяванага ў царкоўнай практыцы напеву пад уздзеяннем традыцыйнага музычнага мыслення, па-трэцяе, адрозненні «народных» версій ад ужытковых  песнапенняў на узроўні арганізацыі вербальнага раду, музычнага рытму, гукавышыннай структуры і фактурнага складу.

Расійскімі музыколагамі былі выяўлены механізмы ўлучэння песнапенняў праваслаўнага богаслужэння ў музычныя «коды» пахавальна-памінальных абрадаў [2, 7, 10]. Разгляд шматсускладнага пахавальнага рытуалу на сучасным этапе яго існавання раскрыў як арганічнасць у коле яго кампанентаў царкоўных песнапенняў, так і іх функцыі у межах традыцыйнага пахавання.

Для многіх даследчыкаў паказальна ўвага да выканальніцкіх азначэнняў і народнай «тэрміналогіі», звязанай з быццём праваслаўных песнапенняў у традыцыйнай культуры. Пры гэтым, калі ў артыкулах С. Латышавай і С. Падрэзавай [8, 12] аб'ектам даследчыцкай зацікаўленасці становяцца непасрэдна выканальніцкія характарыстыкі «голасу» трапара Пасхі, то для Н. Гіляравай [1] яны сталі момантам, які дазволіў праз кампутарны аналіз аудыёфіксацый напрамую суаднесці сітуатыўны фактар выканання богаслужбовага песнапення  са стылістычнымі адрозненнямі варыянтаў («*церковный*» і «*уличный*»).

У беларусазнаўчых даследаваннях праблема функцыянавання царкоўных песнапенняў у сялянскім музычным побыце не мае такой грунтоўнай распрацоўкі[2]. У апошні час яна набыла раскрыццё ў якасці спецыяльнай у даследваннях аўтара. Спробы вызначэння спецыфікі адаптацыі праваслаўных песнапенняў носьбітамі беларускай вуснатрадыцыйнай культуры і разгляду шырокага спектра іх этнафанійных версій прадстаўлены ў шэрагу публікацый аўтара [18–20].

Пытанне «народных версій» праваслаўных песнапенняў у беларускай этнапесеннай традыцыі яшчэ чакае свайго грунтоўнага асэнсавання, якое, як сёння ўжо зразумела, запатрабуе ўліку вельмі шырокага спектра фактараў.

### Спіс літаратуры:

1. Гилярова, Н. К истории и методике исследования звука в традиционной культуре / Н. Гилярова // Звук в традиционной культуре: сб. науч. ст. / Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского ; сост. Н. Гилярова. – М., 2004. – С. 3–21.
2. Данченкова, Н. Деревенский обычай «ходить по покойнику». Мирская православная традиция молений об умерших (Владимирская область) / Н. Данченкова // Религиозный опыт народной культуры. Образы. Обычаи. Художественная практика : Сб. ст. – М., 2003. – С. 173–225.

[1] Адзначым, што спецыяльны пласт этнамузыкалагічных даследванняў утварае вывучэнне перапрацоўкі у рэпертуары традыцыйных спевакоў песнапенняў пасхальнага перыяду. Пры гэтым даследчыцкая ўвага канцэнтруецца вакол трапара *Христос воскресе из мертвых* як галоўнага песнапення Пасхі [3, 4, 11, 14].

[2] Адзінкавыя звесткі аб выкананні песнапенняў праваслаўнага богаслужэння ў час Пасхі і двунадзесятых свят Праваслаўнай Царквы – Раждзаства Хрыстовага, Богаяўлення, – у момант святочных абходаў двароў, а таксама і ў хаце поруч з іншымі «святымі» песнямі змяшчаюцца ў выданнях, прысвечаных рэгіянальным і лакальным этнапесенным традыцыям [15–17].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Енговатова, М. Народные версии тропаря Пасхи / М. Енговатова // Смоленский музыкально-этнографический сборник. – М. : Индрик, 2003. – Т. 1: Календарные обряды и песни. – С. 246–259.
4. Енговатова, М. Пасхальный тропарь «Христос воскресе» в народной песенной традиции западных русских территорий / М. Енговатова // Экспедиционные открытия последних лет. Народная музыка, словесность, обряды в записях 1970–1990-х годов : статьи и материалы ; сост. и отв. ред. М. Лобанов. – СПб. : Дмитрий Буланин, 1996. – С. 72–88.
5. Енговатова, М. Традиция исполнения тропаря Пасхи «Христос воскресе» / М. Енговатова, С. Латышева // Смоленский музыкально-этнографический сборник. – М. : Индрик, 2003. – Т. 1: Календарные обряды и песни. – С. 235–245.
6. Жимулева, Е. Рождественские песнопения в сибирской фольклорной традиции (текстологическое исследование) / Е. Жимулева // Народная культура Сибири: научные поиски молодых исследователей. – Омск, 2001. – С. 154–159.
7. Жимулева, Е. Православные песнопения в народных похоронно-поминальных обрядах (на материале сибирской фольклорной традиции) / Е. Жимулева // Гуманитарные науки в Сибири. – 2008. – № 4. – С. 138–142.
8. Латышева, С. Народная терминология, связанная с музыкальными и вербальными текстами пасхального периода / С. Латышева // Голос и ритуал: материалы междунар. науч. конф., Москва, май 1995 г. / редкол.: Е. Дорохова [и др.]. – М. : ГИИ, 1995. – С. 67–71.
9. Молчанова, Т. Рождественский тропарь обиходного «простага напева» в среднелужской песенной традиции / Т. Молчанова // Механизм передачи фольклорной традиции: материалы XXI Междунар. молодеж. конф. памяти А. Горковенко, Санкт-Петербург, апрель 2001 г. / Рос. ин-т истории искусств; редкол.: Н. Абубакирова-Глазунова [и др.]. – СПб., 2004. – С. 204–218.
10. Пашина, О. Музыкальный код погребального обряда Смоленщины (этнография исполнения плачей, поминальных стихов и церковных песнопений) / О. Пашина // Смоленский музыкально-этнографический сборник. – М. : Индрик, 2003. – Т. 2 : Похоронный обряд. Плачи и поминальные стихи. – С. 122–151.
11. Подрезова, С. Пасхальный тропарь «Христос воскресе» в северо-восточных районах Смоленской области: к проблеме ладоинтонационного анализа / С. Подрезова // Антропология. Фольклористика. Лингвистика : Сб. ст. – СПб., 2001. – Вып.1. – С. 172–210.
12. Подрезова, С. Отражение музыкально-стилевых особенностей распевов пасхального тропаря «Христос воскресе» в народной терминалогии (по материалам экспедиций в Смоленскую и Тверскую области) / С. Подрезова // Сб. науч. тр. / Моск. гос. консерватория им. П. И. Чайковского. – М., 2004. – Сб. 48: Фольклор : современность и традиция. – С. 192–203.
13. Румянцева, А. Мы ходили-искали святую Коляду: музыкально-этнографические материалы по Рождеству и Святкам в Петербургской губернии / А. Румянцева, Т. Молчанова ; науч. ред. Е. Васильева. – СПб., 2005. – 104 с.
14. Теплова, И. Распев пасхального тропаря «Христос воскресе» в крестьянской традиции северо-западных областей России / И. Теплова // Православие и культура этноса: Тез. док. междунар. науч. симп. 9–13 октября 2000г. – М., 2000. – С. 63–64.
15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвіннe. – 910 с.
16. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.
17. Фальклор Міёршчыны: Каляндарныя святочна-абрадавыя традыцыі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці / літ. апрац. В. Басько. – Мінск : БелДІПК, 2002. – 96 с.
18. Чарнова, К. Праваслаўная гімнаграфія ў выканальніцкіх «перакладах»: вуснатрадыцыйныя версіі богаслужбовых песнапенняў / К. Чарнова // Музычная культура Беларусі: перспектывы даследавання: матэрыялы XIV Навуковых чытанняў памяці Л.С. Мухарынскай, Мінск, 11-12 крас. 2005 г. / Беларус. дзярж. акад. музыкі; склад. Т.С. Якіменка. – Мінск, 2005. – С. 46–51.
19. Чарнова, К. Пасхальны трапар «Христос воскресе» у беларускай этнапесеннай традыцыі / К. Чарнова // Музыкознание к началу XXI века : состояние и перспективы: науч. труды Белорусской государственной академии музыки / Белорус. гос. акад. Музыки ; сост. и науч. ред. Е.Н. Дулова. – Минск, 2009. – Вып. 18. Серия 6, Вопросы современного музыкознания в исследованиях молодых ученых. – С. 28–40.
20. Чернова, Е. Песнопения православного богослужения в исполнительских версиях / «переводах» носителей белорусской этнопесенной традиции // Отечественная этномузыкология: история науки, методы исследования, перспективы развития : мат. Межд. науч. конф., 30 сентября – 3 октября 2010 / СПб гос. конс. им. Н.А. Римского-Корсакова ; редкол.: Лобкова А.Н. (науч. ред.), Мехнецова К.А., Подрезова С.В. (отв. ред.) и др. – СПб.: Университетский образовательный округ Санкт-Петербурга и Ленинградской области, 2011. – Т. 2. – С. 147–155.
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ